Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36

DOI:10.17951/we.2023.9.1.161-173 | Wschód Europy • Восток Европы • East of Europe vol 9, 1 / 2023

**Jerzy Garbiński**
Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej w Lublinie
ORCID ID: https://orcid.org/0000-0003-4410-4154
e-mail: jerzy.garbinski@mail.umcs.pl

# Роля літоўскага фактару ў фарміраваньні беларускага каталіцкага сьвятарства ў першай чвэрці XX стагодзьдзя

Каб вызначыць сутнасьць літоўскага фактару і яго ролі-уплыву на фарміраваньне беларускага каталіцкага сьвятарства ў першай чвэрці XX стагодзьдзя, патрэбна адказаць на наступныя пытаньні:

- па-першае, чаму менавіта літоўскі фактар стаў адным з вызначальных у працэсе фарміраваньня нацыянальна-сьведамага беларускага каталіцкага сьвятарства дадзенага перыяду?
- па-другое, як выглядалі параметры літоўскага ўплыву – яго кірунак, характар і маштаб?
- па-трэцяе, да якіх эфектаў-вынікаў прысутнасьць гэтага фактару ў беларускім хрысьціянскім руху прывяло?

Калі прааналізаваць стан дасьледваньня ролі літоўскага фактару ў працэсе фарміраваньня беларускага каталіцкага сьвятарства ў першай чвэрці XX ст., трэба, нажаль, канстатаваць што гэтая тэма не дачакалася комплекснага дасьледаваньня – ні ў выглядзе навуковых артыкулаў, ні манаграфій. Гэты факт аднак не сьведчыць аб адсутнасці публікацый у беларускай, літоўскай, а таксама польскай гістарыяграфій, якія б у той ці іншай ступені закраналі гэтую праблему. Большасьць зь іх аднак мае пераважна фрагментарны ці фактаграфічна-апісальны характар.

У беларускай гістарыяграфіі дасьледуемая намі тэма звычайна разглядалася ў кантэксце беларускага хрысьціянскага руху першай чвэрці XX стагодзьдзя. Размова, у першую чаргу, ідзе пра публікацыі аднаго зь лідэраў Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі кс. Адама Станкевіча, прысьвечаныя гісторыі беларускага хрысьціянскага руху да пачатку Другой сусьветнай вайны і пытаньню ўвядзення

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



беларускай мовы ў Каталіцкім Касьцёле ў першай чвэрці XX стагодзьдзя[1]. Гэтыя працы, падрыхтаваныя на багатым фактаграфічным матэрыяле, не страцілі сваёй актуальнасьці да сёньняшняга дня. Поруч з манаграфіямі кс. А. Станкевіча, заслугоўваюць на ўвагу публікацыі кс. Уладзіслава Талочкі, што былі надрукаваныя ў міжваенны перыяд у часопісе «Przegląd Wileński», і ў якіх сярод іншага аналізавалася ідэалогія беларускага каталіцкага сьвятарства і варункі яго экзістэнцыі на пачатку XX стагодзьдзя і ў Другой Рэчы Паспалітай[2].

Тэма рэлігійнага жыцьця беларусаў у разглядаемы намі пэрыяд знайшла адлюстраваньне таксама ў працах прадстаўнікоў беларускай дыяспары на Захадзе, у прыватнасьці а. Л. Гарошкі[3] і а. Аляксандра Надсона[4].

Сярод публікацый беларускіх гісторыкаў у Польшчы варта адзначыць дасьледаваньні Ю. Туронка[5] і М. Мароз [6] .

У польскай гістарыяграфіі заслугоўваюць на ўвагу працы кс. Т. Гурскага MIC, прысвечаныя біскупу Юргісу Матулайцісу-Матулявічусу і пытаньню беларусізацыі рэлігійнага жыцьця ў Віленскай дыяцэзіі ў часы яго біскупства[7]. Зь іншых польскіх публікацый варта адзначыць дасьледаваньні Я. Тамашэўскага[8], кс. Я. Буковіча MIC[9] і с. Г. Стшэлецкай[10], прысьвечаныя дзейнасці беларускіх сьвятароў-марыянаў у Друі і гісторыі Кангрэгацыі сясьцёр-эўхарыстак.

Асабліваю вартасьць пры разглядзе-аналізе ролі літоўскага фактару ў беларускім хрысьціянскім руху першай чвэрці XX стагодзьдзя ў цэлым, і ў фарміраваньні нацыянальна-сьведамага беларускага каталіцкага сьвятарства у прыватнасьці, маюць матэрыялы з архіву Кангрэгацыі сьвятароў-марыянаў у Рыме. Яны дазваляюць больш глыбока зразумець пункт гледжання літоўскіх гіерархаў,

1 A. Stankiewicz, *Rodnaja mowa u światyniach*, Wilnia 1929; Id., *Biełaruski chryśćijanski ruch*, Wilnia 1939.

2 W. Tołłóczko, *Z zagadnień katolickiego kleru białoruskiego,* „Przegląd Wileński", nr 1,Wilno 1925, s. 3; *Zadania katolicyzmu na tak zwanych kresach,* „Przegląd Wileński", nr 1, Wilno 1922; *Znaczenie rządów biskupa Matulewicza w Wilnie,* nr 4, Wilno 1927.

3 L. Horoszko, *Pad znakam „ruskaje i polskaje wiery",* „Bożym Szlacham", nr 62–65 Paryż 1954.

4 A. Nadson, *Druja i Hreka-Katalickaja Carkwa na Biełarusi*,1924–1938, Londyn 2001; Id., *Mahdalena Radziwił i Hreka-Katalickaja Carkwa*, Londyn 2001.

5 J. Turonek, *Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921–1939*, Warszawa 2000; Id., *Biełaruskija Maryjanie u Drui*, „Spadczyna", nr 5, Mińsk 1991, s, 51–55; Id., *Miżwajennaja unija u Zachodniaj Biełarusi*, „Spadczyna", nr 5, Mińsk 1992, s. 73–78;

6 M. Moroz, *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.

7 T. Górski, *Stosunek biskupa Jerzego Matulewicza do spraw językowych w diecezji wileńskiej (1918–1925)*, Rzym 1970.

8 J. Tomaszewski, *Białoruska Chrześcijańska Demokracja. Uwagi o kryteriach ocen*, [w:] *Studia polsko--litewsko-bialoruskie*, pod. red. J. Tomaszewskiego, E. Smułkowej, H. Majeckiego, nr 31, Warszawa 1988, s. 157–176.

9 J. Bukowicz, *Świadkowie wiary. Marianie prześladowani przez hitleryzm i komunizm*, Warszawa 2001.

10 H. Strzelecka, *Początki Zgromadzenia Sióstr Służebnic Jezusa w Eucharystii (1923–1945),* Warszawa 1987.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



у прыватнасьці біскупаў Юргіса Матулайціса-Матулявічуса і Пятраса Бучыса, на рэлігійнае жыцьцё ў ІІ Рэчы Паспалітай, а таксама на спробы беларусізацыі ў Каталіцкім Касцёле ў першай чвэрці ХХ стагодзьдзя і мэтазгоднасьць такіх крокаў. Гаворка ідзе перш за ўсё пра іх эпісталярныя калекцыі[11] і карэспандэнцыю дзеячаў беларускага хрысьціянскага руху – кс. Ф. Абрантовіча[12], кс. А. Цікоты[13] і кс. У. Талочкі[14] .

Час фарміраваньня нацыянальна-сьведамага беларускага сьвятарства, як, зрэшты, і беларускага хрысьціянскага руху, у адрозненьне ад падобнага працэсу ў літоўцаў, прыпадае толькі на пачатак ХХ стагодзьдзя. На гэта склалася шмат прычын. У значнай ступені гэты працэс быў запаволены царскімі ўладамі пасьля студзеньскага паўстаньня 1863–1864 гадоў у перыяд абвастрэння расейска-польскай ідэалагічнай барацьбы на беларуска-літоўскіх землях. Зьмены адбыліся ў выніку рэвалюцыі 1905–1907 гадоў у Расеі. У тым часе царскія ўлады знялі шэраг абмежаванняў, у прыватнасьці забарону на друк у беларускай мове. Гэта мела свае наступствы.

Неўзабаве ў Пецярбургу і Вільні было зарганізавана некалькі выдавецкіх суполак, у прыватнасьці першае беларускае выдавецтва пад назвай "Zahlanie sonce i u naše wakonce" і "Naša Chata". З 1906 году ў Вільні пачалі выходзіць першыя перыядычныя выданні ў беларускай мове: спачатку тыднёвік "Наша доля", а пасьля яго закрыцьця – ліберальна-дэмакратычная «Наша Ніва». Пэрыёдык адыграў значную ролю ў гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і ў разьвіцьці адраджэнскай літаратуры. Менавіта ў перыяд "нашаніўства" сфарміравалася нацыянальна-сьведамая беларуская інтэлігенцыя, у тым ліку лідэры, дзеячы і ўдзельнікі беларускага хрысьціянскага руху.

Ажыўленьне беларускай культурна-выдавецкай дзейнасьці ў Пецярбургу і Вільні пасьля рэвалюцыі 1905 году аказала істотны ўплыў на фарміраваньне нацыянальнай сьвядомасьці беларускіх студэнтаў-клерыкаў і сьвятароў. Не ў апошнюю чаргу да гэтага спрычынілася прыхільнае стаўленьне да беларускай справы каталіцкага біскупа Стэфана Дзенісевіча. Як капітульны вікарый Магілёўскай архідыяцэзіі, ён рэкамендаваў сьвятарам выкарыстоўваць родную мову ў пастырскай працы і заахвочваў да перакладаў рэлігійнай літаратуры на беларускую мову[15]. Не менш важную ролю ў фарміраваньні беларускай каталіцкай інтэлігенцыі адыграў і асветніцкі гурток беларускай моладзі «Хатка», які дзейнічаў у Гародні. Яго ўзначаліў кс. прэфект Ф. Грынкевіч, адзін з пачынальні-

11 Archiwum Generalne Marianów w Rzymie (dalej: AGM (Rzym)), Dziennik bp J. Matulewicza z lat 1918–1925, s. 76.
12 AGM (Rzym), korespondencja ks. F. Abrantowicza.
13 AGM (Rzym), korespondencja ks. A. Cikoty.
14 AGM (Rzym), korespondencja ks. W. Tołłoczki.
15 Zob. J. Garbinski, *Biełaruskija relihijnyja dziejaczy XX stahodździa. Życciarysy, martyrałohija, uspaminy*, Mińsk-Monachium 1999, s. 63–64.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



каў беларускага хрысьціянскага руху[16]. Шэраг сяброў гэтага гуртка сталі пазьней выдатнымі дзеячамі і ўдзельнікамі нацыянальнага адраджэньня.

Лідэры беларускага нацыянальнага руху ў пачатку ХХ стагоддзя разумелі, што ні Каталіцкі Касцёл, ні Праваслаўная Царква не могуць у поўнай меры паспрыяць пераадоленьню рэлігійнага расколу беларусаў зьвязанага, сярод іншага, з культурна-цывілізацыйным суперніцтвам паміж Польшчай і Расеяй. У такіх варунках, як адзначаў беларускі філосаф і публіцыст Уладзімер Самойла, было вырашана абраць накірунак, найбольш спрыяльны для беларускай справы:

"Ужо пачынальнікі нацыянальнага Адраджэньня, увогуле абыякавыя да канфесійна-рэлігійных справаў, выступілі з думкай зьвярнуцца да мінуўшчыны, да гістарычнай царкоўнай вуніі, бачачы ў ёй нявыкарыстаныя дагэтуль магчымасьці для стварэння Беларускай Нацыянальнай Царквы. Надавалі ёй падвойную ролю. З аднаго боку, вунія павінна была сцэментаваць у адзін духоўны маналіт падзелены канфесійна народ. З другога боку, вунія павінна была стаць духоўнай заслонай, якая абараняла кансалідуючы беларускі нацыянальны арганізм ад дэнацыяналізацыйных уплываў і расколаў абодвух духоўных імперыялізмаў: расейскага праваслаўя і польскага каталіцтва"[17].

У інтарэсах беларускага нацыянальнага руху рабіліся спробы выкарыстаць "пацяпленьне" ў адносінах паміж Каталіцкім Касьцёлам і расійскім урадам. Гэтаму садзейнічаў і царскі дэкрэт аб свабодзе веравызнаньня ад 17 красавіка 1905 году. Па ініцыятыве аднаго з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэньня Івана Луцкевіча і мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага ў 1904–1909 гадах рабіліся спробы аднавіць вунію на беларускіх этнічных землях. Яна павінна была стаць падмуркам для беларускага нацыянальнай царквы і пераадолець рэлігійныя падзелы[18]. Напачатку, як успамінаў пазьней Антон Луцкевіч, існаваў праект парцэляцыі вялікіх зямельных абшараў у Беларусі спецыяльна створаным для гэтага акцыянерным таварыствам[19]. Усю справу фінансаваў мітрапаліт А. Шаптыцкі. Меркавалася пасяліць на надзеленыя землі частку ўкраінскіх сялян-вуніятаў, якія прапагандавалі б вунію сярод беларускага насельніцтва. У гэты праект былі ўжо ўкладзены значныя сродкі. Аднак да яго ажыцьцяўлення не дайшло, бо расійскія ўлады не далі згоды на дзейнасць акцыянернага таварыства. У 1906–1909 гадах мітрапалітам А. Шаптыцкім і І. Луцкевічам была зроблена яшчэ адна спроба. Для гэтага планавалася набыць маёнтак у мясцовасьці Дзядзілавічы Барысаўскага раёна. Там планавалася зарганізаваць вуніяцкую парафію, якая ў будучыні магла б ператварыцца ў цэнтр па аднаўленню вуніі на Беларусі[20]. Два беларускія сьвятары – У. Гарасімовіч і Я. Зэльба – ужо былі прызначаныя на свя-

[16] *Ibidem*, с. 59.
[17] Privatissimus [W. Samojło], *Unia w przeszłości i przyszłości*, „Przegląd Wileński", nr 7–8, Wilno 1929, s. 9.
[18] A. Łuckiewicz, *Mitrapalit Szeptycki i biełaruski ruch*, „Bohosłowija", nr 4, Lwów 1926, s. 45–48.
[19] *Ibidem*.
[20] *Ibidem*.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



тарскую працу ва ўсходнім абрадзе. Аднак гэтыя намеры перакрэсьлілі расейскія ўлады. Яны спрычыніліся да арышту ў сакавіку 1911 году кс. У. Гарасімовіча, які быў абвінавачаны ў «польскім сепаратызме» і асуджаны на тры гады ссылкі ў Архангельск[21]. Зь яго пачалася мартыралёгія беларускага сьвятарства ў XX стагодзьдзі.

Варта адзначыць, што сваім уздымам беларускі хрысьціянскі рух быў абавязаны як унутраным, так і зьнешнім фактарам. Адным з важных стымулаў у станаўленьні і разьвіцьці беларускага хрысьціянскага руху, акрамя ініцыятываў мітрапаліта А. Шаптыцкага, была рэлігійная і культурна-асьветніцкая дзейнасьць літоўскіх сьвятароў, іх адносіны да ўласнага народу і культуры, змаганьне за родную мову ў Каталіцкім Касьцёле.

Ад пачатку XX стагодзьдзя, а пасьля і ў міжваенны перыяд літоўскае сьвятарства актыўна падтрымлівала ўвядзеньне беларускай мовы ў рэлігійнае жыццё ў беларускамоўных і змешаных каталіцкіх парафіях у Віленскай дыяцэзіі і ў Магілёўскай архідыяцэзіі. Пад іх уплывам многія беларускія студэнты-клерыкі і сьвятары ўсьвядомілі сваю нацыянальную прыналежнасьць.

Стаўленьне літоўскіх сьвятароў да беларускага нацыянальнага руху яскрава дэманстравалі іх выказваньні ў літоўскім пэрыядычным друку пачатку XX стагодзьдзя. Толькі ў 1907 годзе часопіс «Vilniaus Zinios» апублікаваў некалькі артыкулаў, прысвечаных беларускаму пытанню ў Каталіцкім Касцёле[22]. У адным з іх пад назвай «Baltgudziu atgijimas ir kunigai-lietuviai» («Адраджэнне беларусаў і літоўскія ксяндзы») кс. Думбрэ пісаў, між іншым:

«[...] Літоўскія сьвятары больш ад ўсіх могуць паспрыяць нацыянальнаму адраджэньню беларусаў, бо іх поўна ў Беларусі. Ведама, што зь літоўскіх сьвятароў палякі хацелі садраць дзьве скуры: астудзіць іх «літваманію» і выкарыстаць інструмэнтальна – для паланізацыі беларусаў. Зразумела, літоўскія ксяндзы ня могуць браць на сваё сумленьне такую задачу, якая не адпавядае ані іх нацыянальным пачуцьцям, ані іх пакліканьню, а менавіта захаваньню каталіцкай веры і маральнасьці сярод людзей.

Літоўскія ксяндзы, працуючы сярод беларусаў, мусяць лічыць галоўным у сваёй працы не пашырэньне польскасьці, але ўнясеньне духу хрысьціянства ў беларускі нацыянальны рух. На сваёй бацькаўшчыне ксяндзы паспяхова выконвалі гэтую працу. Дзякуючы іх «праклятай» літваманіі літоўцы-каталікі могуць чытаць не толькі «N.Gadyne», «Skardas», але і «Saltini» і нават «V. Zinios».

Зь іншага боку, беларусы, здаецца, не могуць да сёньняшняга дня пахваліцца ні каталіцкай пэрыёдыкай, ні каталіцкімі культурна-асьветніцкімі арганізацыямі. «Наша доля» і «Наша ніва» вельмі падобныя на літоўскія «Skardas» і «Ukininka». Калі ў такім накірунку будуць дзейнічаць грамадзкія арганізацыі, такія, да прыкладу, як «Бел. Мас.», несумненна, што плынь радыкалізму возьме

[21] Zob. J. Garbinski, *Biełaruskija relihijnyja dziejaczy…*, s. 48–49.
[22] Zob.: „Vilniaus Żinios", nr 18, Wilno 1907, s. 1.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



верх над нацыянальным рухам беларусаў. І такі ход падзей тут адбудзецца хутчэй, чым у Летуве. Таму што тут больш цёмнага пралетарыяту.

Польскія сьвятары, здаецца, да сёньняшняга дня не бачаць новай небяспекі для каталіцкай веры ў Беларусі. Іх цешыць вялікая колькасць вуніятаў, якія сталі каталікамі. Літоўскія сьвятары павінны быць больш пільнымі, чым іх польскія калегі, і адкрыта прызнаць свой дэмакратызм, падтрымоўваючы беларускую справу. Бо ў працілеглым выпадку зь літоўскімі ксяндзамі можа здарыцца тое самае, што з нямецкімі ў Куршы: ксяндзы пайшлі ў адзін бок, а авечкі — у другі...»[23].

Ксёндз Думбрэ падкрэсьліваў, што літоўскія сьвятары павінны пачаць сваю працу, паводле ўказаньняў папы Пія X – з увядзеньня ў касьцёлы мовы мясцовага насельніцтва, якой яны карыстаюцца ў штодзённым жыцьці. Аўтар публікацыі адзначаў таксама, што «у чыста беларускіх парафіях усё набажэнства павінна адбывацца на мове беларусаў, у змешаных парафіях – у залежнасці ад колькасці розных моваў. У зьмешаных школах выкарыстоўваць абедзве мовы: беларускую і літоўскую»[24].

Тлумачыў такі падыход да справы наступным: „Такім чынам, можна было б пазбегнуць блытаніны і спрэчак, якія ўзнікаюць па нацыянальнай глебе. На мой погляд, большасць спрэчак у касьцёлах вырашалася б станоўча, калі б у зьмешаных парафіях сьвятары абмяркоўвалі справы самі, паміж сабой, без чыёй-небудзь дапамогі, зьвяртаючы ўвагу ў першую чаргу на сапраўдныя патрэбы парафіян. Сваім удзелам у літаратурным жыцьці беларусаў, а таксама ў дзейнасьці іх грамадска-асьветных арганізацый і ўва ўсёй культурнай працы літоўскія ксяндзы заслужылі б удзячнасць беларусаў, і яшчэ больш паспрыялі б зьліжэньню гэтых двух некалі вялікіх у мінулым, а цяпер падняволеных народаў у іх барацьбе з агульнымі ворагамі […]"[25].

Вышэй згаданая публікацыя кс. Думбрэ, акрэсьлівала такім чынам прастору і параметры ўзаемадзеяньня літоўскага фактара зь беларускім нацыянальна-адраджэнскім рухам, яго накірунак, характар і маштаб. Бадай галоўнае месца і ролю у гэтым фактары адводзілася нацыянальна-сьведамаму каталіцкаму сьвятарству. Можа не ўва ўсім, але ў многім спадзяваньні-заклікі кс. Думбрэ знайшлі сваю практычную рэалізацыю.

Рэлігійна-нацыянальная дзейнасць літоўскага каталіцкага сьвятарства, спрыяючы літуанізацыі ў пастырскай дзейнасці, мела на пачатку XX стагодзьдзя вырашальны ўплыў на абуджэнне нацыянальнай сьвядомасьці беларускіх студэнтаў-клерыкаў і сьвятароў. Шмат хто зь іх, у прыватнасьці кс.кс. Ф. Абрантовіч, Г. Бэта, В. Гадлеўскі, Ф. Грынкевіч, А. Лісоўскі, Л. Хвецька, А. Цікота, сталі лідэрамі актыўнымі дзеячамі і пашыральнікамі ідэі беларусізацыі Каталіцкага

[23] Kung. Dumbre, *„Baltgudžiu atgijimas ir kunigai-lietuviai"*, „Vilniaus Žinios", nr 25, Wilno 1907, s. 1.
[24] *Ibidem.*
[25] *Ibidem.*

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



Касьцёла, разглядаючы яе як важны фактар у працэсе станаўленьня і разьвіцьця беларускага нацыянальнага адраджэньня.

Гэткім чынам ідэя вызваленьня літоўскага каталіцызму з-пад польскіх уплываў была плённа загаспадаравана і перанесена на родную глебу беларускімі сьвятарамі і студэнтамі-клерыкамі Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, а таксама выхаванцамі Віленскай каталіцкай семінарыі.

У душпастырскай працы гэта было заініцыявана шэрагам сьвятароў, і ў прыватнасьці, кс. Г. Бэтам. Пасьля заканчэньня Літоўскай каталіцкай семінарыі ў Сейнах ён працягваў навучаньне ў Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу. Там у 1912 годзе разам з кс. А. Лісоўскі і беларускім культурным дзеячам Б. Эпімахам-Шыпілам спрычыніўся да стварэньня беларускага асьветніцкага гуртка[26]. У дзейнасьці суполкі ўдзельнічалі некалькі вядомых у будучыні дзеячоў беларускага хрысьціянска-дэмакратычнага руху, у прыватнасьці кс. кс. Л. Хвецька, А. Цікота, В. Гадлеўскі, А. Неманцэвіч, А. Станкевіч, В. Шутовіч, М. Пятроўскі.

Дарэчы, такі ж культурна-адукацыйны гурток студэнтаў-клерыкаў, толькі крыху раней, а менавіта ў 1911 годзе, быў зарганізаваны ў Віленскай каталіцкай семінарыі[27]. Аднак ён меў больш складаныя ўмовы для свайго функцыянавання з-за моцных паланізацыйных тэндэнцый не толькі ў семінарыі, але і ўва ўсёй Віленскай дыяцэзіі[28].

Важным момантам, які спрыяў фарміраваньню сьвядомага беларускага сьвятарства і кансалідацыі беларусаў-католікаў, было стварэньне часопіса «Беларус», які выходзіў у 1913–1915 гадах у Вільні[29]. Гэта быў першы каталіцкі пэрыёдык у беларускай мове. У той час з рэдакцыяй супрацоўнічала некалькі адэптаў Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу, у прыватнасьці А. Цікота, В. Гадлеўскі, П. Пякарскі, А.Станкевіч і група ксяндзоў-беларусаў з Віленскай дыяцэзіі, а менавіта кс.кс. Іл. Бобіч, М. Далецкі, Ул. Талочка. За некаторымі выключэннямі, гэты беларускі рэлігійны пэрыёдык быў станоўча ўспрыняты касьцельнымі ўладамі і мясцовым каталіцкім духавенствам.

І ў гэтым выпадку словы падтрымкі прыйшлі з літоўскага боку. Сваё благаславеньне даслаў тыднёвіку «Biełarus» адзін з тагачасных літоўскіх іерархаў, жамойцкі біскуп Пранцішкус Карэвічус. Варта заўважыць, што на працягу ўсяго свайго біскупства ён быў вялікім сябрам і абаронцам беларускага сьвятарства і вернікаў. Біскуп П. Карэвічус маральна і матэрыяльна падтрымоўваў літоўскі і беларускі незалежніцкі і рэлігійны рух. Улетку 1914 году, знаходзячыся ў Ватыкане, ён зьвярнуў увагу кардынала Мэры дэль Валь, дзяржаўнага сакратара Апостальскай Сталіцы, на неабходнасць увядзеньня беларускай мовы ў набажэнствы ў сваёй дыяцэзіі. Бо, як падкрэсьліў, «каля 60 тысяч ягоных беларусаў, пропаведзі і да-

[26] J. Garbinski, *Biełaruskija relihijnyja dziejaczy…*, s. 500.
[27] A. Stankiewicz, *Rodnaja mowa…*, s. 74–75.
[28] *Ibidem.*
[29] Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі (ЭГБ), т. 1, Мінск 1994,

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



датковыя службы слухаюць толькі на польскай мове, а пераважная большасьць гэтай мовы не разумее»[30] .

Прыязна паставіліся да часапісу «Biełarus» і польскія ксяндзы, у прыватнасьці кс. мансеньёр Я. Курчэўскі, кс. К. Міхалкевіч, біскуп-суфраган Віленскай дыяцэзіі кс. Л. Жэброўскі, кс. М. Руткоўскі. Зь вялікай прыхільнасьцю да пэрыёдыка адносіўся біскуп С. Дзенісевіч, які матэрыяльна і духоўна падтрымліваў яго выданьне да сваёй смерці ў 1913 годзе.

Заслугоўвае на ўвагу і той факт, што на просьбу беларускага святара кс. Іл. Бобіча, аднаго з супрацоўнікаў часопіса папа Пій X таксама ўдзяліў рэдакцыі пэрыёдыка апостальскае блаславеньне[31].

У справы, зьвязаныя з тыднёвікам, ангажаваліся таксама сьвецкія асобы, у прыватнасьці княгіня Магдалена Радзівіл. Менавіта дзякуючы яе сродкам рэдакцыя «Biełarusa» зарганізавала пры пэрыёдыку выдавецтва, якое выдала ў беларускай мове некалькі кніг рэлігійна-маральнага зьместу («Niekalki slou ab pakucie", «Miatawyja listoczki", «Z rodnaha zahonu", «Batlejka", «Naszto bełarusam hazety", «Czławiek na wyszyni hodnaści", «Тлумачэньне абрадаў Р.-К. Касьцёла», «Кніжачка для службы Божай у нас» і інш.). Да друку было падрыхтавана яшчэ некалькі пазыцыяў, у прыватнасьці «Жыціі Сьвятых Божых», «Гісторыя Касцёла» і «Маёвыя набажэнствы»[32]. Аднак пачатак Першай сусветнай вайны перакрэсьліў гэтыя планы і перашкодзіў далейшаму выхаду часопіса. Некалькі спробаў аднавіць яго выданьне пасля вайны праваліліся зь фінансавых прычынаў.

Беларускі хрысьціянска-дэмакратычны друк, поруч з часопісам «Biełarus» быў прадстаўлены таксама часопісам «Svietač», які выходзіў у 1916 годзе ў Петраградзе. Нажаль, да 1921 году, акрамя перакладаў («Буквар для добрых дзяцей каталікоў», «Кароткі Катэхізіс» Р. Філахоўскага і пераклады кс. Ф. Будзькі), беларусы практычна не мелі рэлігійнай літаратуры ў беларускай мове.

Поруч са сьвятарамі яе спрабавалі ствараць і сьвецкія асобы. У гэтую справу актыўна ангажавался і адна са знакавых постацяў беларускай адраджэнскай літаратуры паэта Цётка (Алаіза Пашкевіч). У 1910–1914 гадах яна падрыхтавала каталіцкі малітоўнік для дзяцей пад назваю «Малітоўнік для беларускіх дзетак»[33]. Таксама і грамадска-культурны дзеяч В. Ластоўскі, выконваючы просьбу беларусаў-каталікаў, у 1911 годзе звярнуўся да касьцёльных уладаў Віленскай дыяцэзіі па дазвол на выданьне «Беларускай кантычкі»[34]. Такой згоды аднак не атрымаў. Сітуацыя на гэтай дзялянцы рэлігійнага жыцьця зьмянілася на лепшае толькі падчас біскупства Ю.Матулайціса-Матулявічуса, які, бадай, ці не першым

[30] J. Garbinski, J, Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*, Warszawa 2003, s. 165–166.
[31] *Ibidem*, s. 38–39.
[32] B. Poczopko, *„Biełarus" (Ze wspomnień redaktora),* „Przegląd Wileński", nr 16, Wilno 1925, s. 3–5.
[33] A. Stankiewicz, *Biełaruski chryścijanski ruch*, Wilnia 1939, s. 37.
[34] Zob. „Chryścijanskaja Dumka", nr 6, Wilno 1938.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



з віленскіх біскупаў на пачатку XX стагодзьдзя даў згоду на малітоўнікі ў беларускай мове.

Дастаткова няпроста вырашэньне рэлігійных і культурных праблемаў беларусаў ішло і ў міжваенны перыяд у складзе II Рэчы Паспалітай. Першапачаткова беларускія нацыянальныя дзеячы спадзяваліся, што Каталіцкі Касьцёл і Праваслаўная Царква падтрымаюць іх памкненьні. Аднак усё часцей шукалася апірышча на ідэі беларускай вуніяцтва, якая магла б аб'яднаць прыхільнікаў каталіцтва і праваслаўя ды стварыць асновы для зарганізаваньня Беларускай Нацыянальнай Царквы. З гэтаю мэтаю па ініцыятыве ксяндзоў-беларусаў І. Бобіча, А. Станкевіча і Ул. Талочка 12–13 ліпеня 1921 году у Вільні адбыўся трэці з'езд беларускага каталіцкага духавенства[35]. Ён скіраваў увагу ня толькі на справу вуніі, але таксама паглыбленьне каталіцкай дзейнасьці, пашырэньне роднай мовы ў Каталіцкім Касьцёле і кансалідацыі беларускага сьвятарства[36]. Тады ж. на зьезьдзе, было створана аб’яднаньне сьвятароў-беларусаў пад назвай «Сьветач». Але сваёй дзейнасці яно так і не разгарнула – польскія адміністрацыйныя ўлады адмовіліся яго легалізаваць. Тым не менш, у міжваенны перыяд Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя налічвала каля 600 сяброў, у тым ліку больш за 50 каталіцкіх сьвятароў.

Нельга не адзначыць, што фарміраваньне беларускага сьвятарства (як каталіцкага, так і праваслаўнага, і пратэстанцкага) у міжваеннае дваццацігодзьдзе было абумоўлена як мінімум трыма фактарамі — палітычным, сацыяльным і рэлігійным. Але першы зь іх вызначаў канчатковую мэту беларускай палітыкі – пабудову незалежнай дзяржавы. Пазіцыю беларускага каталіцкага і праваслаўнага духавенства ў гэтай справе трапна вызначыў кс. Ул. Талочка, які пісаў: «Ідэалогія беларускіх сьвятароў у палітычным жыцці, вядома, залежыць ад агульнай беларускай палітыкі, у якую яна ўваходзіць як частка цэлага. Агульная беларуская палітыка сёньня нескладаная: яна патрабуе супрацоўніцтва з кожным, хто дапамагае беларусам набліжацца да ідэалу магчымай культурнай і палітычнай незалежнасьці. Адсюль мы бачым розныя арыентацыі ў беларускім лягеры: савецкую, польскую, літоўскую, але кожная з гэтых арыентацыяў мае адну ідэю – незалежнасьць Беларусі. Гэтая дыферэнцыяцыя беларускага грамадства, уцягнутага ў арбіту «самастойна» віруючых суседніх сілаў, палітычна адлюстроўваецца і на беларускім духавенстве»[37].

Варта заўважыць, што ў гэты няпросты для беларусаў міжваенны пэрыяд у складзе II Рэчы Паспалітай літоўскі фактар па-ранейшаму не толькі выяўляў сваю прысутны, але і па-ранейшаму дзеіў. Цяпер толькі з абмежаванай польскімі

35 А.Станкевіч, *Родная мова ў сьвятынях*, Вільня, с. 130–131.

36 *Ibidem*.

37 W. Tołłoczko, *Z zagadnień katolickiego kleru białoruskiego,* „Przegląd Wileński", nr 1, Wilno 1925, s. 3.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



ўладамі актыўнасьцю. Быў ён зьвязаны з адным зь выбітных літоўскіх рэлігійных дзячаў біскупам Ю. Матулайцісам-Матулевічусам.

Пра адносіны гіерарха да беларускага адраджэнскага руху і рэлігійнага жыцця ў Віленскай дыяцэзіі найбольш яскрава сьведчаць запісы зь яго дзёньніка. Акрэсьліваючы свае адносіны да беларускай справы і ролі ў ёй сьвятароў, пасьля размоваў з кс. А.Цікотам, адным зь лідэраў беларускага хрысціянскага руху, Ю. Матулайціс-Матулявічус напісаў: «[...] Я сказаў, што я – каталіцкі біскуп і хачу аднолькава служыць усім і буду аднолькава служыць і клапаціцца пра духоўныя патрэбы ўсіх маіх вернікаў. Для мяне ўсе роўныя: і беларусы, і палякі, і літоўцы. Але паколькі тут, у Вільні, нацыянальныя пытаньні вельмі адчувальныя, трэба быць асабліва асьцярожным. Я сказаў, што не толькі не буду выступаць супраць руху, які мае на мэце адраджэньне беларусаў, але нават буду яго падтрымоўваць, каб ён не пайшоў у няправільным кірунку. Аднак стаўлю ўмовы: 1) старайцеся весці працу па-каталіцку; 2) вы, святары, у гэтай працы, не прадавайце сябе, свае духоўныя справы і сваё жыццё; старайцеся быць прыкладам; 3) дакладвайце мне пра ўсё, каб я ведаў, што вы робіце.

Я раіў ім, сьвятарам, падтрымоўваць людзей на духу, гаварыў, што можна закласьці кляштары для мужчын і жанчын; асабліва ў гэтай працы абяцаў сваю падтрымку. Я дадаў, што мне не да нацыянальнасьцяў, але што буду падтрымліваць іх працу з наступных меркаваньняў: 1) я бачу, што беларускі народ непісьменны, ня ведае каталіцтва, ня ўмее вызнаваць веры, але ён навучыцца гэтаму налепш, калі такое яго навучаньне будзе весьціся ў роднай мове; 2) беларусы адраджаюцца, адраджаюцца і падымаюцца: калі святары не накіруюць гэты рух у патрэбнае рэчышча, людзі збочаць і пойдуць супраць Касьцёла; 3) задачай Касцёла з'яўляецца не навучаньне мовам, а навучаньне таму, што неабходнае для збаўленьня, навучаньне на роднай мове, зразумелай людзям; 4) беларусы, калі Касьцёл паспрабуе іх дэнацыяналізаваць, усьвядоміўшы гэта, будуць яго вінаваціць, Трэба дбаць таксама пра праваслаўных беларусаў і пра тых, хто былі вуніятамі; мы можам да іх дастукацца, толькі прапаведуючы ім слова Божае па-беларуску; вось усё гэта беларускія сьвятары павінны лічыць сваім абавязкам і пакліканьнем»[38] .

Варта падкрэсліць, што біскуп Ю. Матулайціс-Матулявічус на працягу ўсяго свайго біскупства ў Віленскай дыяцэзіі імкнуўся да таго, каб у Каталіцкім Касьцёле было месца таксама для беларусаў і іх роднай мовы. Падтрымліваў шырокія кантакты са сьвятарамі-беларусамі з Кангрэгацыі сьвятароў-марыянаў і з дыяцэзіі. Асаблівыя рэляцыі ўтрымліваў з кс. А.Цікотам, зь якім карэспандаваў у трох мовах — літоўскай, беларускай і польскай. Падтрымліваў намаганьні беларусаў выдаваць каталіцкія часопісы і рэлігійную літаратуру ў роднай мове. У міжваенны пэрыяд стаў адным з заснавальнікаў беларускага кляштара марыянаў у Друі і Кангрэгацыі сясьцёр-эўхарыстак. Ён заахвочваў беларускіх сьвятароў

[38] AGM (Rzym), *Dziennik bp J. Matulewicza z lat 1918–1925*, s. 47–48.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



і студэнтаў-клерыкаў пашыраць родную мову ў рэлігійным жыцці і душпастырскай дзейнасці. Пасьлядоўна выступаў супраць паланізацыі рэлігійнага жыцьця ў літоўскіх і беларускіх парафіях, у выніку чаго увайшоў у канфлікт з польскімі ўладамі і мусіў пайсьці са сваёй рэлігійнай пасады ў Віленскай дыяцэзіі.

Зь іншых выбітных прадстаўнікоў літоўскага сьвятарства, якія аказалі істотны ўплыў на фарміраваньне беларускае духавенства і актыўна падтрымоўвалі справу беларусізацыі Каталіцкага Касьцёла ў першай чвэрці XX ст., без сумневу, трэба адзначыць кс. Пятраса Краўяліса. Ён займае асаблівае месца ў гісторыі як літоўскага хрысціянскага руху, так і беларускага. Кс. П.Краўяліс быў адным з блізкіх супрацоўнікаў біскупа Ю. Матулайціса-Матулявічуса ў час яго кіраваньня Віленскай дыяцэзіяй. На працягу многіх гадоў узначальваў літоўскае асьветніцка-клерыкальнае таварыства «Rytas» і выкладаў у каталіцкай семінарыі ў Вільні, дзе бараніў студэнтаў-клерыкаў беларускай і літоўскай нацыянальнасцей ад дыскрымінацыі з боку семінарыйных улад і польскай эндэцыі. Падтрымліваў каталіцкую рэлігійную пэрыёдыку і рэлігійную літаратуру ў беларускай мове. Такую паставу дэманстраваў і як рэлігійны цэнзар, даючы станоўчую апінію для кнігі кс. Іл. Бобіча «Нядзельныя Евангельлі і Навукі» у беларускай мове. Адначасна зьвяртаў увагу на тое, што некаторыя літоўскія сьвятары не разумеюць беларускага адраджэнскага руху і не да канца ўсьведамляюць мэтазгоднасьць яго падтрымкі[39] Змагаўся супраць закрыцьця літоўскіх школаў польскімі адміністрацыйнымі ўладамі. У 1927 годзе быў арыштаваны і зьняволены. Нягледзячы на супраціў часткі польскага духавенства Віленшчыне пашырэнню беларускай мовы ў міжваенны перыяд у Віленскай архідыяцэзіі, падтрымліваў дзейнасць Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.

Важнасьць літоўскага фактару для беларусаў у варунках міжваеннай Польшчы задэманстраваў і літоўска-беларускі зьезд, які адбыўся 4 травеня 1930 году і меў на мэце кансалідацыю беларускага і літоўскага грамадзтва у справе абароны абедзьвюх моваў у Каталіцкім Касьцёле [40].

У падсумаваньні трэба адзначыць, што літоўскі фактар у беларускім як хрысьціянскім, так і адраджэнскім руху ў першай чвэрці XX ст. дзеіў на некалькіх узроўнях:

– заахвочваў беларускіх студэнтаў-клерыкаў да арганізацыі ўласных суполак праз іх удзел у літоўскіх культурна-асьветніцкіх гуртках, якія існавалі пры каталіцкіх семінарыях і духоўных акадэміях (Сейны, Вільня, Пецярбург);
– садзейнічаў фарміраваньню ў Каталіцкім Касцёле нацыянальна-сьведамага беларускага сьвятарства;
– служыў важным прыкладам-матыватарам у працэсе беларусізацыі рэлігійнага жыцця ў Каталіцкім Касьцёле на Беларусі;

[39] J. Garbinski, J. Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański*…, s. 195–196.
[40] *Ibidem*.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



– быў падтрымкай для рэлігійнай перыёдыкі і кнігавыдавецкай дзейнасьці ў беларускай мове;
– спрыяў стварэнню беларускіх арганізацыяў рэлігійнага і нацыянальнага характару (у тым ліку БХД);
– нягледзячы на паланізацыю, аказаў значны ўплыў на фарміраваньне нацыянальнай сьвядомасьці беларускай каталіцкай супольнасьці і, несумненна, дзякуючы беларускім каталіцкім сьвятарам спрыяў пашырэньню беларускай нацыянальнай ідэі.

**Анатацыя:** У артыкуле аналізуецца ўплыў літоўскага фактару на фарміраваньне нацыянальна-сьведамага беларускага сьвятарства ў Каталіцкім Касьцёле на Беларусі. Разгледжаны мэты, накірункі, характар, а таксама маштаб і эфекты такога ўздзеяньня.
**Ключавыя словы:** літоўскія каталіцкія святары, беларускае каталіцкае сьвятарства, Каталіцкі Касьцёл на Беларусі, беларусізацыя

### Wpływ czynnika litewskiego w formowaniu białoruskiego duchowieństwa katolickiego w pierwszej ćwierci XX wieku

**Abstrakt:** W artykule podjęto próby analizy wpływu czynnika litewskiego na stanowienie świadomego swej narodowości duchowieństwa białoruskiego w Kościele katolickim. Pokazano zarówno cele, kierunki, charakter, jak również skalę oraz skutki takiego oddziaływania.
**Słowa kluczowe:** litewscy księża katoliccy, białoruskie duchowieństwo katolickie, Kościół katolicki na Białorusi, białorutenizacja

### The role of the Lithuanian factor in the formation of the Belarusian Catholic clergy in the first quarter of the 20th century

**Abstract:** The article attempts to analyze the influence of the Lithuanian factor on the formation of Belarusian clergy aware of their nationality in the Catholic Church. The goals, directions, nature, as well as the scale and effects of such impact are shown.
**Keywords:** Lithuanian Catholic priests, Belarusian Catholic clergy, Catholic Church in Belarus, Belarusianization

## Bibliografia

### Źródła

Archiwum Generalne Marianów w Rzymie, korespondencja ks. A. Cikoty.
Archiwum Generalne Marianów w Rzymie, korespondencja ks. F. Abrantowicza.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 12/06/2026 03:21:36



Archiwum Generalne Marianów w Rzymie, korespondencja ks. W. Tołłoczki.
Archiwum Generalne Marianów w Rzymie, Dziennik bp J. Matulewicza z lat 1918–1925.
Encyklapedyja historyi Biełarusi, т. 1, Мінск 1994.

**Periodyki**

„Vilniaus Żinios", Wilno 1907.
„Bohosłowija", Lwów 1926.
„Bożym Szlacham", Paryż 1954.
„Chryścijanskaja Dumka", Wilno 1938.
„Przegląd Wileński", Wilno 1922, 1925,1927, 1929.
„Spadczyna", Mińsk 1991, 1992.

**Opracowania**

Bukowicz J., *Świadkowie wiary. Marianie prześladowani przez hitleryzm i komunizm*, Warszawa 2001.
Garbinski J., *Biełaruskija relihijnyja dziejaczy XX stahodździa. Życciarysy, martyrałohija, uspaminy*, Mińsk–Monachium 1999.
Garbinski J., Turonek J., *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku* Warszawa 2003.
Górski T., *Stosunek biskupa Jerzego Matulewicza do spraw językowych w diecezji wileńskiej (1918–1925)*, Rzym 1970.
Moroz M., *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.
Nadson A., *Druja i Hreka-Katalickaja Carkwa na Biełarusi*,1924–1938, Londyn 2001.
Nadson A., *Mahdalena Radziwił i Hreka-Katalickaja Carkwa*, Londyn 2001.
Stankiewicz A., *Biełaruski chryścijanski ruch*, Wilnia 1939.
Stankiewicz A., *Rodnaja mowa u światyniach*, Wilnia 1929.
Strzelecka H., *Początki Zgromadzenia Sióstr Służebnic Jezusa w Eucharystii (1923–1945),* Warszawa 1987.
*Studia polsko-litewsko-bialoruskie*, red. J. Tomaszewskiego, E. Smułkowej, H. Majeckiego, Warszawa 1988.
Turonek J., *Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921–1939*, Warszawa 2000.